

# Прасякнутыя любоўю

**Фестываль-конкурс народнай песні "Агмень" імя А.У. Рашчынскага ў чацвёрты раз аздобіў культурнае жыццё Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М.І. Глінкі.**

Некалькі дзён у сценах адной з найстарэйшых навучальных устаноў гучалі народныя песні. Іх прэзентавалі больш як 40 удзельнікаў рознага ўзросту, якія прыехалі з усіх рэгіёнаў нашай краіны, а таксама з Санкт-Пецярбурга і Краснадара. У складзе журы былі выбітныя прадстаўнікі музычнай галіны Беларусі і Расіі пад старшынствам мастацкага кіраўніка ансамбля "Бяседа" Леаніда Захлеўнага — народнага артыста Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, спецыяльнай прэміі Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва. Мерапрыемства праходзіла пры падтрымцы ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама, Беларускага саюза кампазітараў і Беларускага саюза музычных дзеячаў.

## ІМЕМ РАШЧЫНСКАГА

Фестываль "Агмень" прысвечаны выдатнаму кампазітару, харавому дырыжору Аляксандру Рашчынскаму (1949—2016), які ўсё жыццё працаваў на карысць Радзімы. Аляксандр Уладзіміравіч, выхаванец легендарнага Яўгена Глебава, у 24 гады заснаваў першае ў краіне аддзяленне "Народна-харавыя спевы" ў Мінскім дзяржаўным музычным вучылішчы імя М.І. Глінкі. Педагагічны талент Рашчынскага не саступаў музычнаму: звыш 35 гадоў гэты чалавек выконваў абавязкі загадчыка аддзялення, кіраўніка хору, настаўніка па дырыжыраванні, апрацоўцы і аранжыроўцы народных песень і выпусціў у свет больш за 40 прафесійных дырыжораў. Як збіральнік фальклору ладзіў экспедыцыі. Зрабіў каля 400 апрацовак беларускіх народных песень.

## У ДАР ПУБЛІЦЫ

Свята адкрыў хор "Бліскавіца" — стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі, лаўрэат міжнародных і рэспубліканскіх творчых спаборніцтваў. Прагучалі песні "Ой, у татачкі" і "Туман-матушка". Удзельнікаў павітаў старшыня дырэкцыі фестывалю-конкурсу "Агмень", старшыня гарадской метадычнай секцыі па харавых дысцыплінах, дырэктар МДМК імя М.І. Глінкі Аляксей Снітко.



Праслухоўванні праходзілі ў чатырох катэгорыях: А — дзеці ад 12 да 15 гадоў, В — навучэнцы сярэдніх спецыяльных устаноў Беларусі і прадстаўнікі Расіі ад 16 да 19 гадоў, С — студэнты і выпускнікі ВНУ ад 20 гадоў, D — носьбіты спадчыны без абмежавання ўзросту.

Завяршыўся "Агмень" гала-канцэртам і цырымоніяй узнагароджання. Падарункамі для гледачоў сталі народныя песні "Ігралі-сваціілі" ад навучэнкі МДМК Кіры Будзіч і "Як пайду я дарогаю" ад студэнткі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Ксеніі Лук'яненка. Аўтэнтычная манера выканання твора "Сыжу сокочу" сёлетняй пераможцы фестывалю Алены Букач (г. Кобрын) зачаравала публіку шчырасцю і ўсхваляванасцю. Гран-пры ўганараваны Аляксандр Морус (г. Кобрын; настаўнік — Наталля Буневіч, канцэртмайстар — Таццяна Пакалюк), які прадставіў песню "Служыў я ў пана".

## З УДЗЯЧНАСЦЮ

Шмат добрых слоў сказала жонка кампазітара Алена Рашчынская і члены журы ў адрас усіх, хто піша гісторыю свята і захоўвае традыцыі народнапесеннага выканальніцтва. Падзякаваў арганізатарам і прафесар кафедры беларускай народнапесеннай творчасці і фальклору БДУКМ Уладзімір Зяневіч.

У заключнай частцы выступілі пераможца першага фестывалю (2019) Анастасія Булатоўская і ўладальніца гран-пры трэцяга (2024) — Анастасія Кальман. У суправаджэнні лаўрэата міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў аркестра рускіх народных інструментаў МДМК (мастацкі кіраўнік і дырыжор Юлія Жураўлёва) прагучалі песні Леаніда Захлеўнага "Зямля мая" і руская народная "Тарантасік" у апрацоўцы Уладзіміра Бурлакова. Апафеоз гала-канцэрта — кампазіцыя Уладзіміра Зяневіча на словы Валерыя Максімовіча "Ой ты, поле каласістае" ў выкананні лаўрэатаў рэспубліканскіх конкурсаў Антона Пракапцова і Анастасіі Воранавай.

Кожны нумар быў прасякнуты бясконцай любоўю да роднага. Дзякуючы гэтаму "Агмень" зноў стаў адной з самых значных падзей каледжа ў галіне сольных народных спеваў.

**Наталля КАРДАШОВА,**
Мінскі дзяржаўны музычны каледж імя М.І. Глінкі